НЕЗАБЫЎНАЕ

# ТОЛЬКІ АДНА СУСТРЭЧА

## Тая падзея пакінула адметны след у сэрцы і свядомасці, а з гадамі, асабліва ў сталым узросце, выклікае неспакойны роздум, больш грунтоўна і важна ацэньваецца і асэнсоўваецца

● Ёсць у жыцці сустрэчы, якія пакідаюць нязгасны след на многія гады. Такая сустрэча адбылася ў мяне некалі з А. Р. Чарвяковым. Гэты чалавек стаяў ля вытокаў стварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Яго самабытная асоба, багатае гістарычнымі падзеямі жыццё, асабісты трагічны лёс у час сталінскага тэрору хвалююць нас і па сённяшні дзень.

З глыбіні памяці ўсплываюць малюнкі далёкага дзяцінства, калі давялося бачыць і чуць гэтага чалавека. Тая падзея пакінула адметны след у сэрцы і свядомасці, а з гадамі, асабліва ў сталым узросце, выклікае неспакойны роздум, больш грунтоўна і важна ацэньваецца і асэнсоўваецца.

...Гэта было ў першай палове трыццатых гадоў. Навіна аб тым, што ў нашу мясцовасць — Асіповіцкі раён, а дакладней, у Лапіцкі сельсавет прыехаў Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў, разнеслася хутка. А. Р. Чарвякова, Старшыню Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР, «усебеларускага старасту», як яго тады называлі, людзі добра ведалі, любілі і паважалі. Памятаю, многія тады расказвалі, як ездзілі да яго «ажно ў Мінск», як ён чула ўнікаў у іх турботы, дапамагаў, падказваў, куды звяртацца, нават сам званіў па іх клопатах. Адзін з маіх аднакласнікаў з гордасцю расказаў, што яго бацька вучыўся ў Чарвякова,— Аляксандр Рыгоравіч быў настаўнікам. Хлапчук гэтым вельмі ганарыўся.

У сувязі з прыездам такога высокага і паважанага госця ў мясцовым клубе (тады ён называўся народны дом) пад вечар сабраўся сход. Людзей было шмат. Без нас, малых, гэта падзея не абышлася. Памятаю, як ля стала прэзідыума непрыкметна паявіўся сярэдняга росту мужчына ў чорным паліто з каракулевым каўняром, у кучомцы. Сказаўшы «Добры дзень» прысутным, ён накіраваўся да крэсла, каб распрануцца. Да яго хуценька падышла тэхнічка, наша добра знаёмая цётка Ганна, і пачала дапамагаць госцю зняць зацярушанае снегам паліто. «Дзякуй, дзякуй,— сказаў госць ветліва, — не трэба турбавацца, я сам». У яго быў круглы адкрыты твар, невялікія вусы, а вочы добразычліва глядзелі на тых, хто прыйшоў. У той жа момант людзі шэптам паміж сабой усхвалявана загаварылі: «Гэта ж Чарвякоў! Чарвякоў...» Я гэтага чалавека таксама пазнаў адразу. У нашай школе вісеў яго партрэт, і ўсе вучні ведалі, якую адказную пасаду займае ён.

Потым пачаўся сход. Калі слова папрасіў Аляксандр Рыгоравіч, стала асабліва ціха, усе слухалі вельмі ўважліва. Запомнілася мне: гаварыў ён аб тым, што ўсёй грамадой трэба брацца за адраджэнне вёскі, будаўніцтва новага жыцця на сацыялістычны лад, змагацца з непісьменнасцю, заклікаў клапаціцца пра школы для сялянскіх дзяцей. Затым адказаў на пытанні, даваў тлумачэнні, пераконваў на прыкладах, калі што было незразумела. Вельмі ўважліва слухаў усіх, хто гаварыў, нешта сабе запісваў. І ўся размова атрымалася шчырая, непасрэдная, нагадвала гутарку з блізкім, родным чалавекам. З людзьмі ў яго былі вельмі цесны кантакт, узаемаразуменне.

Назаўтра мне зноў давялося убачыць Аляксандра Рыгоравіча, калі я вяртаўся са школы пасля заняткаў. Каля хаты, дзе размяшчаўся сельскі Савет, стаяў запрэжаны ў лёгкія сані конь. Неўзабаве з хаты выйшаў А. Р. Чарвякоў, разам з ім некалькі чалавек. Яны аб чымсьці гутарылі, здаецца, раіліся, як лепей праехаць у іншую вёску.

Заўважыўшы нас, некалькіх хлапчукоў каля саняў, Аляксандр Рыгоравіч пацікавіўся, у якім мы класе, ці ёсць у нас сшыткі, падручнікі. Госць з Мінска цёпла развітаўся з усімі, спрытна забраўся ў сані. Па ўсім адчувалася, што ён гэтым відам транспарту вельмі задаволены. Побач з ім ужо ся...

І. ЗЛОТНІК, выдатнік народнай асветы.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы